Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 14:10:47

DOI:10.17951/sb.2022.16.133-141
Studia Białorutenistyczne 16/2022 LITERARY STUDIES
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Siarhei Minskevich / Серж Мінскевіч*

National Academy of Sciences of Belarus (Belarus)
https://orcid.org/ 0000-0002-6185-0936

Дзяды Адама Міцкевіча ў беларускіх перакладах

Mickiewicz's Poem "Forefathers' Eve" in Belarusian Translations

„Dziady" Adama Mickiewicza w przekładach białoruskich

Abstract

This article discusses the history of translations of Adam Mickiewicz's poem *Dziady* (*Forefathers' Eve*) into the Belarusian language. Parts II and IV of the poem, written and published first, were created simultaneously with Adam Mickiewicz's ballad *Romantyczność* (*Romance*). This ballad is considered the manifesto of romanticism in Polish and Belarusian literature. Poem *Dziady* (*Forefathers' Eve*) contains quotes from this ballad, the main ideas of the works coincide. In fact, the poem *Dziady* (*Forefathers' Eve*) is an extended manifesto of romanticism. It is patriotic romanticism. Most of the heroes of the poem act on their own land. These are local peasants, Lithuanian-Belarusian youth. The poem describes Belarusian folk rituals. Therefore, the translation of the poem into Belarusian is important for Belarusian literature and culture. The author of the article gives a chronicle of translations of fragments of the poem into Belarusian, as well as performances of the poem in Belarusian theatres.

Keywords: romanticism, literary translation, manifesto, folk rituals, theatrical performances, Adam Mickiewicz

Abstrakt

Tematem artykułu są pochodzące z różnych lat przekłady poematu Adama Mickiewicza *Dziady* na język białoruski. Najstarsze napisane i wydane części poematu, tj. II oraz IV,

* Артыкул быў напісаны і дасланы ў рэдакцыю незадоўга да смерці аўтара – выдатнага беларускага пісьменніка, перакладчыка, навукоўца Сержа Мінскевіча (12.02.1969– 8.06.2022).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 14:10:47

powstały w tym samym czasie, co uważana za manifest polskiego i białoruskiego romantyzmu ballada *Romantyczność*. Obydwa utwory wiele łączy: w jednym i drugim występują podobne idee, ponadto poemat *Dziady* zawiera fragmenty *Romantyczności*. W swojej istocie poemat Mickiewicza jest rozszerzonym oraz nacechowanym patriotycznie manifestem romantyzmu. Większość bohaterów *Dziadów* to związani ze swoją ziemią miejscowi chłopi albo litewsko-białoruska młodzież. W poemacie zostały opisane białoruskie obrzędy ludowe, dlatego przekłady poematu na język białoruski zajmują znaczące miejsce w literaturze i kulturze Białorusi. Autor artykułu prezentuje kronikę przekładów fragmentów *Dziadów* na język białoruski oraz omawia inscenizacje poematu w teatrach białoruskich.

Słowa kluczowe: romantyzm, przekład artystyczny, manifest, obrzęd ludowy, inscenizacja teatralna, Adam Mickiewicz

Анатацыя

У артыкуле разглядаецца гісторыя перакладаў на беларускую мову паэмы Адама Міцкевіча *Дзяды (Dziady)*. Часткі II і IV паэмы, напісаныя і апублікаваныя першымі, былі створаны адначасова з баладай Адама Міцкевіча *Рамантычнасць* (*Romantyczność*). Гэтая балада лічыцца маніфестам рамантызму ў польскай і беларускай літаратуры. Паэма *Дзяды* змяшчае цытаты з гэтай балады, асноўныя ідэі твораў супадаюць. Па сутнасці, паэма *Дзяды* — пашыраны маніфест рамантызму. Рамантызму „патрыяцэнтрычнага". Большасць герояў паэмы дзейнічаюць на сваёй зямлі. Гэта мясцовыя сяляне, літоўска-беларуская моладзь. У паэме апісваюцца беларускія народныя абрады. Таму пераклад паэмы на беларускую монаву важны для беларускай літаратуры і культуры. Аўтар артыкула прыводзіць хроніку перакладаў фрагментаў паэмы на беларускую мову, а таксама ўзнаўляе гісторыю пастановак паэмы ў беларускіх тэатрах.

Ключавыя словы: рамантызм, мастацкі пераклад, маніфест, народны абрад, тэатральная пастаноўка, Адам Міцкевіч

Над II-й і IV часткамі паэмы *Дзяды* Адам Міцкевіч працаваў 1820–1822 гадах, апублікаваў гэтыя часткі ў 1823 г. у II томе *Паэзіі* (Вільня). Баладу *Рамантычнасць* паэт напісаў у студзені 1821 г., апублікаваў у I томе *Паэзіі* 1822 г. Такім чынам *Рамантычнасць* – прызнаны маніфест рамантызму – была напісана ў той час, калі паэт думаў, разважаў і працаваў над *Дзядамі*. У IV частцы *Дзядоў* ёсць цытаты з *Рамантычнасці*, а герой гэтай часткі – Густаў – паводзіць сябе падобна Карусі – гераіні *Рамантычнасці*. Фактычна, *Дзяды*, спачатку Ковенска-Віленскія (II і IV частка) і потым і Дрэзданскія (III частка), напісаныя ў 1832 г. і ў тым жа годзе выдадзеныя ў Парыжы, – гэта другі, своеасаблівы, разгорнуты ў тэкставай прасторы і часе маніфест рамантызму. Адам Міцкевіч, абапіраючыся на ўзоры заходне-еўрапейскага рамантызму, змог паглыбіць яго, прыўнесці ў яго інавацыйныя элементы. Рамантызм зрабіўся пад пяром творцы патрыяцэнтрычным. Лёс радзімы і народа, яго жыццё, яго вера

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 14:10:47

і вераванні, яго перакананні і імкненні, кодэкс гонару і скарб мудрасці – сталі прадметам літаратуры.

Уважлівы слых паэта адчуў у легендах і паданнях, чарадзейных апавяданнях не толькі сюжэтную прывабнасць для літаратуры, якая абуджала цікавасць публікі, але і ўлавіў, што такія вусна-паэтычныя творы ўтрымліваюць і захоўваюць у сабе лепшыя набыткі народнай свядомасці і могуць уплываць на жыццё і лёс чалавека, пэўным чынам выхоўваючы і накіроўваючы яго на слушны шлях. А таямнічыя абрады, як тэургічныя дзействы – гэта своеасаблівыя пошукі судзеяння з „краінай душ", жаданай краінай справядлівасці і разумення Сусвету. Гэтак універсальнасць маральна-этычных прынцыпаў, якія заўважыў малады літаратар у беларускім святе Дзяды, дазволіла яму азірнуць і перагледзець факты сваёй біяграфіі і гістарычныя падзеі на землях былога Вялікага Княства Літоўскага і Кароны (Польшчы) і ўвесці іх ў агульна культурны кантэкст як прыклады ўзвышэння і моцы чалавечага духу.

Беларускі літаратуразнавец Мікалай Мішчанчук пісаў пра Адама Міцкевіча:

> Беларуская зямля ўзгадавала мастака, прызнанага класіка польскай літаратуры. Аднак ён і класік беларускай літаратуры XIX стагоддзя, што нараджалася ў сілу неспрыяльных грамадска-сацыяльных абставін адразу на беларускай, польскай і рускай мовах. Адам Міцкевіч, што пісаў па-польску, думаў і мысліў па-беларуску, па-ліцвінску (Miščančuk, 1998, s. 40-48).

Відавочна Мікалай Мішчанчук пад выказваннем „думаў і мысліў" меў на ўвазе не канкрэтныя словы, а вобразы, з якіх выбудоўваліся творы паэта. Вобразы ў большасьці сваім былі звязаныя з літоўскім (беларускім) краем.

У падобным рэчышчы разважае англійскі гісторык-паланіст Норман Дэйвіс. Ён сцвярджаў, што: „Міцкевіч, напрыклад, не бачыў аніякай прычыны з-за якой не мог быць адначасова і Палякам, і Ліцвінам"[1] (Davies, 1991, s. 30).

Ліцвінскасць (беларускасць) Адама Міцкевіча асабліва выяўляецца ў паэме *Дзяды*. У ідэйна-тэматычным плане паэма грунтуецца на беларускім матэрыяле (паэт збіраў і вывучаў беларускі фальклор, назіраў за народным беларускімі абрадамі, сам спяваў народныя беларускія песні, цікавіўся гісторыяй Вялікага Княства Літоўскага, ведаў старабеларускія тэксты).

Героі паэмы маюць рэальных прататыпаў – гэта сучаснікі маладога творцы, большасць з іх – ураджэнцы Літвы (Беларусі). Важнае месца ў іх грамадзе займаюць сакурснікі і сябры Адама Міцкевіча – філаматы і філарэты. Аўтар падае іх у *Дзядах* пад сапраўднымі імёнамі ці прыяцельскімі зычлівымі мянушкамі. Усё што з імі адбываецца – гэта недалёкая па часе гісторыя краю. Польская мова паэмы перасыпана беларускімі лексічнымі і сінтаксічнымі адзінкамі.

[1] Тут і далей пераклад цытат і назваў твораў з польскай мовы аўтара артыкула.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 14:10:47

У артыкуле *Пра крытыкаў і рэцэнзентаў варшаўскіх* Адам Міцкевіч пісаў: „Прызнаюся, што не толькі не засцерагаюся правінцыялізмаў, але наўмысна іх ужываю" (Mickiewicz, 1955, c. 256).

Паэт свядома набліжаў тэксты сваіх твораў, што напісаны па матывам легенд, паданняў, абрадаў да мясцовага гучання, чым, насамрэч, падграваў цікавасць грамадскасці да беларускай мовы.

Усё вышэй прыведзенае дае падставы разглядаць паэму *Дзяды* Адама Міцкевіча як адзін з дзейсных чыннікаў развіцця ідэі беларускага адраджэння і новай беларускай літаратуры.

Дзяды Адама Міцкевіча, асабліва II і IV часткі, былі добра вядомыя на тэрыторыі Беларусі, бо ў беларускай літаратуры XIX – пачатку XX стагоддзя заўважаюцца наследаванні, рэмінісцэнцыі, цытаванні і нават элементы эпігонства да гэтай паэмы ў творах беларускіх пісьменнікаў XIX – пачатку XX стагоддзя (творах як беларускамоўных, так і польскамоўных). Напрыклад: драматычная паэма *Жыццё сіраты* Яна Баршчэўскага, балады *Наваградскі замак* Яна Чачота, паэмы *Апантаны*, *Халімон на каранацыі*, вершаванае апавяданне *Стаўроўскія дзяды* Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, *Паштальён* Уладзіслава Сыракомлі, паэма *З гісторыі жыцця і песні* Янкі Лучыны, верш *Быў у чысцы* Францішка Багушэвіча, паэмы *На Дзяды*, *Зімою*, *Курган*, *Сон на кургане*, *Урывак драматычнай паэмы* і вершы *Сон*, *Цару неба й зямлі, У бяссоную ноч*, *З маіх песень*, *Сельскія могілкі* Янкі Купалы. Пісьменнікі Беларусі працягвалі і развівалі рамантычную традыцыю, якую распачаў Адам Міцкевіч на землях былога Княства Літоўскага.

Несумненна, пераклад паэмы *Дзяды* вельмі важны для дыскурсу беларускай літаратуры. Такі пераклад неабходна лічыць не толькі гуманітарнай з'явай, але можна разглядаць як зварот беларусаў да сваіх каранёў дзеля самапазнання, самааэнсавання, самаўдасканалення.

Гісторыя перакладу знакамітага твора Адама Міцкевіча на беларускую мову пачалася ў 1925 годзе ў Вільні, дзе тады дзейнічаў асяродак беларускай культуры.

У часопісе „Студэнцкая думка" быў апублікаваны урывак з II часткі *Дзядоў*, перакладзены на беларускую мову Наталляй Арсенневай. Гэта апісанне абраду Дзядоў, які ладзілі сяляне ў закінутай капліцы на могілках.

Вось, напрыклад, як гучыць знакаміты пачатак II часткі паэмы, які ў Польшчы стаў агульнавядомым, афарыстычным:

> Ciemno wszździe, g³ucho wszździe,
> Co to bźdze, co to bźdze?
> (Mickiewicz, 1999, t. 1, s. 20).

> Ціша ночы, цемра ночы
> Штось праροча, штось праροча
> (Mickiewicz, 1925, s. 26).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 14:10:47

23 красавіка 1927 года ў „Беларускае выдавецкае таварыства ў Вільні" даслаў ліст Галляш Леўчык. Вось што пісаў паэт:

> Я пераклаў чуць не цэлыя «Дзяды»… Я пераклаў I частку, II частку, і сцэну IX – ноч Дзядоў III ч., шмат чаго з IV часткі; адным словам цэлы беларускі этнаграфічны змест «Дзядоў», што ўсё збярэцца на спорую кніжку, каторую як найхутчэй варта было б выдаць праз Т-ва, – усё гэта я цяпер перапісваю начыста. Апрача таго я на «Дзяды» пачаў пісаць сцэнарый для кінематографу, каторы пашлецца да Амерыкі, каб зняць усё на фільм і магчы паказваць на экране, – вось добра будзе, бо «Дзяды» для нас ёсць усё-ткі цікава і важна паэма, што ўзята з нашага беларускага жыцця Адамам Міцкевічам… (Leŭčyk, 1980, s. 140).

На жаль, пра той чыставік нічога не вядома.

Наступны ўсплёск цікавасці ў Беларусі да *Дзядоў* прыпадае на 1940 год – выйшлі два пераклады ўрыўка з паэмы: верша-паслання *Сябрам Рускім*, які выканаў Мікола Байкоў („Чырвоная змена", 1940, 24 лістапада), і *Да рускіх Сяброў* у перакладзе Канстанціна Цітова („Полымя рэвалюцыі", 1940, 11, с. 111).

У 1948 годзе адзначаліся 150-я ўгодкі з дня нараджэння Міцкевіча – тады з'явіўся трэці пераклад верша *Рускім Сябрам* з-пад пяра Міхася Машары, першы ў гісторыі беларускай літаратуры пераклад урыўка з *Вялікай імправізацыі* – яго зрабіў Піліп Пестрак („Літаратура і мстацтва", 1948, 25 снежня.), а Максім Танк пераклаў *Хор стральцоў* з I часткі *Дзядоў* і песню Фэлікса з III часткі *Дзядоў* („Полымя", 1948, 12, с. 80). У 1955 годзе да 100-х угодкаў са дня смерці паэта ў зборніку *Выбраныя творы* Адама Міцкевіча (Мінск, 1955) былі апублікаваны пераклады *Вялікай імправізацыі* Максіма Лужаніна і *Помніка Пятру Вялікаму* Міхася Машары. У 1969 год – да 160-х угодкаў з дня нараджэння Адама Міцкевіча ў зборніку твораў паэта пад назвай *Зямля наварудская, краю мой родны…* (Мінск, 1969) быў апублікаваны пераклад фрагмэнта II часткі *Дзядоў* аўтарства Янкі Сіпакова.

Трэба заўважыць, што гэты пераклад вельмі арганічны, ён захоўвае тэмпарытм арыгінала. І можна сказаць, што Янка Сіпакоў зрабіў паэтычнае адкрыццё. Ён знайшоў трапную зарыфмаваную фразу для першых «крылатых» радкоў паэмы (якія мы прыводзілі вышэй).

Яго пераклад:

> Цёмна, людзі... Страшна, людзі...
> Нешта будзе, нешта будзе?
> (Mickiewicz, 1969, s. 121).

На нашу думку, у гэтай слоўнай формуле удала выкарастаны зваротак *„людзі!"* Часам гэты зваротак выступае ў якасці папярэджання: *Людзі, асцярожна! Людзі, увага!* Той, хто прамаўляе, бачыць ці адчувае каля сябе нешта небяспечнае, альбо

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 14:10:47

дзіўнае, непрыемнае: *Людзі, як холадна! Людзі як цёмна!* Альбо, наадварот, цікавае і захапляльнае: *Людзі, якая прыгажосць!* Дый і самі людзі побач з прамоўцам могуць быць, а могуць і не быць, зваротак можа быць рытарычны, нікому не адрасаваны, сказаны «ў паветра». Зарыфмаваная фраза, якую знайшоў Янка Сіпакоў, несумненна, шмат у чым адпавядае арыгіналу.

У 80–90-х гг. XX ст. Алена Расолька пераклала ўступную да паэмы баладу *Прывід* (пераклад уключаны ў корпус каментарыяў да выдання паэмы ў 1999 г. (Mickiewicz, 1999, t. 1, s. 241–244). З'явіліся пераклады Пятра Бітэля – II частка і вершы з *Урыўка*. Аўтар артыкула бачыў у сярэдзіне дзевяностых рукапісы гэтых перакладаў у выдавецтве „Мастацкая літаратура". Верагодна Пятро Бітэль мог перакласці ўсю паэму. На жаль, цяпер гэтых рукапісаў у выдавецтве няма і дзе яны – невядома. У той час былі апублікаваны два пераклады Пятро Бітэля: верша *Сябрам Маскалям* („Спадчына", 1992, 2, с. 23) і верша *Помнік Пятру Вялікаму* („Роднае слова", 1993, 12, с. 17–18).

Песню Фелікса з II часткі *Дзядоў* пераставрыла Інэса Куря'н – гэта песня, як рэдакцыя папярэдняга чарнавога варыянту ўвайшла ў поўнае выданьне *Дзядоў* 1999 года (Mickiewicz, 1999, t. 2, s. 69–71).

Напрыканцы 90-х гг. да 200-х угодкаў Адама Міцкевіча выйшаў поўны пераклад паэмы, выкананы аўтарам гэтага артыкула (двухтомнік з польскім і беларускім тэкстам, Мінск: Медысонт, 1999 г.), а таксама пераклад паэмы *Дзяды* Кастуся Цвіркі (без першай часткі), выдадзены адной кнігай (Мінск: Беллітфонд, 2001) і перавыдадзены ў асобным томе серыі „Беларускі кнігазбор" у 2003 годзе.

Кастусь Цвірка ў прадмове да свайго перакладу напісаў:

> У асобных выданнях «Дзядоў» публікуецца і знойдзены ў паперах паэта ўрывак часткі I – «Дзяды. Відовішча». Думаецца, публікаваць яго разам з адабранымі аўтарам часткамі паэмы няма патрэбы: па-першае, сам ён не ўключаў гэты, магчыма, выпадкова ацалелы ўрывак у прыжыццёвыя выданні «Дзядоў», а па-другое, урывак зусім не ўпісваецца ў выструненую самім паэтам канву твора (Cvirka, 2001, s. 6.)

Перакладчыцкай стратэгіяй аўтара гэтага артыкула была поўная перадача беларускай мовай усіх знойдзеных фрагментаў паэмы. У выданне была ўключана так званая „пацалункавая страфа", якую зняла царская цэнзура, і захавалася яна толькі таму, што была перапісана сябрамі Адама Міцкевіча. Таксама ўключаны ў корпус каментарыяў 32-радковы фрагмент тэксту *Nie do sąsiadek pewnie…*, акрэслены, а не перакрэслены аўтарам. Бачна – аўтар не хацеў пазбавіцца цалкам гэтага фрагмента, а меў намер выкарыстаць яго ў іншым месцы.

Варта сказаць, што пад час працы над перакладам аўтар артыкула сустракаўся з Янкам Сіпаковым і спытаў у яго, ці былі спробы працягнуць пераклад *Дзядоў*. Сіпакоў адказаў, што не. І яшчэ ён дазволіў выкарыстаць вынайдзеную ім рыфму *людзі – будзе*, таму ў наш пераклад мы гэтае вынаходніцтва ўключылі, аднак мадэрнізавалі.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 14:10:47

Першы радок мы пакінулі з тым жа сэнсавым развіццём, як у арыгінале:

цёмна – глуха,

а не як у Янкі Сіпакова:

цёмна – страшна.

У I частцы паэмы Старац расказвае Хлопчыку пра свае адчуванні падчас абраду Дзядоў на могілках, і страху ён не адчуваў, у яго, як і ў многіх прысутных, узнікала ўрачыстае хваляванне.

Другі радок мы алітарацыйна наблізілі да арыгінала *co to – штосьці* (выкарыстоўваючы *ц* і *т*):

Цёмна, людзі... Глуха, людзі...
Штосьці будзе... Штосьці будзе...
(Mickiewicz, 1999, t. 1, s. 21).

Адна з каштоўнасцяў *Дзядоў* Адама Міцкевіча для Беларусі заключаецца ў магчымасці зазірнуць праз паэтычнае ўспрыманне аўтара ў глыб народнага светапогляду і светаадчування. У аснову паэмы пакладзены абрад свята памінання продкаў *Дзяды*, якое дагэтуль існуе на Беларусі. Дакладна невядома, ці браў паэт непасрэдны ўдзел у абрадзе Дзядоў, ці ўяўляў яго праз пераказы Яна Чачота, але тое, што Адам Міцкевіч чуў паданні, замовы, песні ад людзей, што жылі побач, падаецца несумненным.

У 2012 годзе да перакладу *Дзядоў* на беларускую мову звярнуліся тэатральныя дзеячы. Аляксандр Янушкевіч паставіў *Дзяды* ў Беларускім дзяржаўным тэатры лялек паводле сваёй сцэнічнай версіі паэмы (рэжысёр абраў пераклад аўтара гэтага артыкула). У 2013 годзе *Дзяды* паставілі ў тэатры „Ч" – рэжысёр Рамуне Кудзманайтэ, аўтар сцэнічнай вэрсіі Максім Клімковіч (пераклад паэмы – аўтара гэтага артыкула). У 2015 годзе ў Брэсцкім акадэмічным тэатры драмы быў пастаўлены спектакль *Дзяды. Бресцкая крэпасць*, дзе ў канву Міцкевічавых *Дзядоў* упісаны трагічныя аповеды, датычныя Халакосту падчас Другой сусветнай вайны. Пастаноўку ажыццявіў польскі рэжысёр Павел Пасіні ў супрацоўніцтве з драматургам Патрыцыяй Даловы (быў выбраны абраны пераклад паэмы аўтара гэтага артыкула).

Кожны са спектакляў атрымаўся своеасаблівы, адкрывае ўласцівую толькі яму шматвектарную прастору ў глыбінях Міцкевічавых *Дзядоў*. Тры беларускія пастаноўкі паводле паэмы *Дзяды*, што адбыліся на працягу трох гадоў сведчаць пра запатрабаванасць у гэтым вялікім творы Адама Міцкевіча грамадскай супольнасці Беларусі.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 14:10:47

REFERENCES / BIBLIOGRAFIA

Sources / Źródła

Mickievič, Adam. (1925). Dziady. Č. II. Pieraklad Natalli Arsiennievaj. *Studenckaja dumka*. 4(5). [Міцкевіч, Адам. (1925). Дзяды. Ч. II. Пераклад Наталлі Арсенневай. *Студэнцкая думка*. 4(5)].

Mickievič, Adam. (1969). Dziady. Č. II. Pieraklad Janki Sipakova. U: Adam Mickievič. *„Ziamlia navahrudskaja, kraju moj rodny"* [Zbornìk: peraklad z pol′skaj movy]. Minsk: Bielaruś. [Міцкевіч, Адам. (1969). Дзяды. Ч. II. Пераклад Янкі Сіпакова. У: Адам Міцкевіч. *„Зямля навагрудская, краю мой родны"* [Зборнік: пераклад з польскай мовы]. Мінск: Беларусь].

Mickievič, Adam. (1999). *Dziady. Č. II.* Pieraklad Sierža Minskieviča. Minsk: Miedysont [Міцкевіч, Адам. (1999). *Дзяды. Ч. II.* Пераклад Сержа Мінскевіча. Мінск: Медысонт].

Mickiewicz, Adam. (1955). *Dzieła.* T. V: *Pisma prozą.* Warszawa: Czytelnik.

Studies / Opracowania

Cvirka, Kastuś. (2001) Pradmova. U: A. Mickiewicz. *Dziady*. Minsk: Bellitfond. [Цвірка, Кастусь (2001). Прадмова. У: А. Міцкевіч. *Дзяды*. Мінск: Беллітфонд].

Davies, Norman. (1991). *Boże igrzysko. Historia Polski.* T. II. Kraków: Znak.

Lieŭčyk, Haĺjaš. (1980). *Dolia i chlieb: vybranyja tvory*. Minsk: Mastackaja litaratura. [Леўчык, Гальяш. (1980). *Доля і хлеб: выбраныя творы*. Мінск: Мастацкая літаратура].

Miščančuk, Mikalaj. (1998). Bielaruski ramantyzm XIX–XX stst: dumki i naziranni. U: *Asoba i tvorčasć A. Mickieviča ŭ kantekscie susviet. lit. Zb. materyjalaŭ Mižnar. navuk.-tearet. kanf.* Brest: Vyd-va Bresc. dziarž. un-ta. [Мішчанчук, Мікалай. (1998). Беларускі рамантызм XIX–XX стст: думкі і назіранні. У: *Асоба і творчасць А. Міцкевіча ў кантэксце сусвет. літ. Зб. матэрыялаў Міжнар. навук.-тэарэт. канф.* Брэст: Выд-ва Брэсц. дзярж. ун-та].

SUBMITTED: 9.05.2022
ACCEPTED: 10.10.2022
PUBLISHED ONLINE: 22.12.2022

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Siarhei Minskevich / Серж Мінскевіч – Białoruś, Mińsk, Narodowa Akademia Nauk Białorusi, Instytut Badań Literackich im. Janki Kupały; dr; spec.: literaturoznawstwo; zainteresowania naukowe: romantyzm, polsko-białoruskie związki literackie, przekład, wersyfikacja.

Adres: Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы, Нацыянальная Акадэмія навук Беларусі, пр-т. Незалежнасці, 66, Мінск, 220072, Беларусь.

Wybrane publikacje:

1. Мінскевіч, Серж. (2015). *Евгений Онегин* А. Пушкіна ў перакладах А. Дудара і А. Куляшова. У: *Матэрыялы Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 29/11/2026 14:10:47

(да 90-годдзя з дня нараджэння І. Я. Навуменкі), Мінск, 26–27 лютага 2015 г. Мінск: Права і эканоміка, с. 411–417.

2. Мінскевіч, Серж. (2016). Ян Баршчэўскі – Адам Міцкевіч: творчыя паралелі, інтэртэкстуальнасць. У: І.Л. Капылов (рэд.). *Беларуска-польскія культурна-моўныя ўзаемадачыненні: ад гісторыі да сучаснаці: зб. навук. арт.* (с. 378–386). Мінск: Беларуская навука.
3. Мінскевіч, Серж. (2016). Параўнальна-супастаўляльны аналіз перакладаў санета Максіма Багдановіча *Паміж пяскоў егіпецкай зямлі* на рускую мову. У: *Першы міжнародны навуковы кангрэс беларускай культуры* (с. 463–468). Мінск: Права і эканоміка.
4. Мінскевіч, Серж. (2017), Еўрапейскі санет у беларускіх перакладах. У: У. Гніламёдаў (рэд.). *Паэтыка літаратурных сувязей* (с. 425–521). Мінск: Беларуская навука.
5. Мінскевіч, Серж. (2018). Параўнальны аналіз перакладаў 90-га санета Уільяма Шэкспіра на беларускую мову. *Полымя*, 7, с. 113–124.